ВІНШУЕМ

# ШЧЫРЫЯ СЛОВЫ, ДУШЭЎНЫ МАТЫЎ




**У чэрвені 2023 года старажытны Слонім прымаў Рэспубліканскі спартыўна-культурны фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу». У яго межах адбылося адмысловае творчае спаборніцтва сярод прыхільнікаў мастацкага слова – І Рэспубліканскі конкурс песеннага тэксту «Вытокі. Вершы пра галоўнае». З вялікай радасцю сустракаем вестку – што ў конкурсе на лепшы песенны тэкст перамагла наша калега па пісьменніцкай арганізацыі, беларуская паэтэса са Слоніма Ірына ВОЙТКА.**

Нагадаем, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Ірына Антонаўна Войтка з’яўляецца аўтарам кніг «Спасціжэнне», «Пагляджу вачамі неба», «Кранаюся вечнасці». Піша і прозу. Жыве ў Слоніме, кіруе раённым літаратурным аб'яднаннем імя Анатоля Іверса пры газеце «Слонімскі веснік». Калектыў літаб’яднання з горада над Шчарай таксама далучыўся да ўдзелу ў спаборніцтве разам з іншымі творцамі-літаратарамі. Член журы конкурсу, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, член Беларускага саюза кампазітараў, кіраўнік арт-групы «Беларусы», кампазітар Валерый Шмат адразу вылучыў вершаваны тэкст Ірыны Войткі: «Калі я ўбачыў гэты тэкст, ён адразу натхніў мяне, загучаў ува мне, адразу пачулася мелодыя».

Згодна з Палажэннем прэстыжнага спаборніцтва паэтаў-песеннікаў непасрэдна падчас фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» прафесійным кампазітарам павінна быць напісана песня, якая ўпершыню прагучыць на галоўнай сцэне фестывалю. Што і адбылося з песняй на словы Ірыны Антонаўны. Песня «Роднае слова» (словы Ірыны Войткі, музыка Валерыя Шмата) з гэтага ўрачыстага моманту *(на фота)* будзе выконвацца арт-групай «Беларусы» на канцэртных пляцоўках краіны.



***

***Ад імя ўсёй літаратурнай і песеннай Гродзеншчыны сардэчна віншуем Ірыну Антонаўну Войтку, нашу калегу па СПБ, беларускую паэтэсу са Слоніма з перамогай у I Рэспубліканскім конкурсе песеннага тэксту «Вытокі. Вершы пра галоўнае». Жадаем Ірыне Антонаўне моцнага здароўя, невычэрпнай творчай энергіі і новых яркіх перамог. Вы – наш гонар!***

Саюз пісьменнікаў Беларусі
Гродна - Слонім

**Паслухаць песню «Роднае слова» (словы Ірыны Войткі, музыка Валерыя Шмата) можна тут:** [http://pisateli.by/2023/slova_rodnae.mp3](http://pisateli.by/2023/slova_rodnae.mp3)



**Ірына Войтка**
**РОДНАЕ СЛОВА**

Як роднае слова
мне люба і міла!
Ты сэрца з маленства
маё паланіла.

Гучыш зразумела,
так шчыра, так блізка –
"матуля", "сцяжынка",
"вясёлка", "калыска".

Цябе дзе пачую –
бы песня пральецца,
і новую песню
задумае сэрца.

І стане так светла,
так чыста, так ясна –
крынічка, праменьчык,
і сонейка красна…

*Прыпеў:*

*Слова роднае,слова роднае,*
*ты радзімае, ты народнае.*
*Ад зямлі маёй ты, ад колаcа.*
*Загучы паўсюль звонкім голасам!*

Хачу, каб жыло ты,
каб вечна гучала,
і добрых каб песень
саткала нямала!

Цудоўнае, мілае,
роднае слова –
народу адметнасць майго
і выснова.

*Прыпеў:*

*Слова роднае, слова роднае,*
*ты радзімае, ты народнае.*
*Ад зямлі маёй ты, ад коласа.*
*Загучы паўсюль звонкім голасам!*

Каб неслі ў сэрцы цябе праз вякі
твае беларусы, мае землякі.
Каб хлеб і Радзіму сваю зберагалі,
ні бедаў, ні войнаў ніколі не зналі.

*Прыпеў:*

*Слова роднае,слова роднае,*
*ты радзімае, ты народнае.*
*Ад зямлі маёй ты, ад коласа.*
*Загучы паўсюль звонкім голасам!*

